## ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ
## Х МІЖНАРОДНАЙ НАВУКОВАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

*Тамара Варфаламеева*

# СЕРЫЯ «ТРАДЫЦЫЙНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ» ЯК ФАЛЬКЛОРНЫ ЗВОД, АРЫЕНТАВАНЫ НА РЭВІТАЛІЗАЦЫЮ ЛАКАЛЬНЫХ СІСТЭМ МАСТАЦТВА ВУСНАЙ ТРАДЫЦЫІ

*Артыкул аналізуе канцэпцыю фальклорнага збору, прысвечанага багаццю і разнастайнасці мастацтва шасці гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі мяжы XX і XXI стагоддзяў. Выданне планавалася як сінхронная фіксацыя і сродак па рэвіталізацыі мясцовых традыцый, і першыя практычныя наступствы яго публікацыі сёння ўжо можна абмяркоўваць.*

*Tamara Varfalameeva*

# SERIES «TRADITIONAL ARTISTIC CULTURE OF BELARUSIANS» AS FOLKLORE COLLECTION FOCUSED ON THE REVITALIZATION OF THE LOCAL ORAL TRADITION ART SYSTEMS

*The article is dedicated to the publication of the folklore richness and diversity of the six historical and ethnographic regions of Belarus turn of XX and XXI centuries. The publication was planned as a means to revive local traditions, and the first effects of its publication can already be discussed.*

Адной з фундаментальных задач беларускай культуры з'яўляецца фарміраванне грамадскай думкі ў напрамку ўсведамлення значнасці традыцыйнай культуры як архетыпічнай, субстанцыянальнай сферы чалавечай духоўнасці і нацыянальнага менталітэту, як асновы развіцця прафесійнай культуры. Гэта задача ў нашай дзяржаве набывае тым большую актуальнасць, што ў кантэксце сусветных этнакультурных працэсаў менавіта беларуская традыцыйная культура мае асаблівую гісторыка-культурную каштоўнасць, паколькі да сённяшняга дня захоўвае аўтэнтычнасць праяў жывой мастацкай культуры вуснага тыпу. Як магутны сродак аб'яднання народа і ўмацавання яго культурнай самастойнасці традыцыйная мастацкая культура ў лепшых яе здабытках павінна шырока распаўсюджвацца, каб садзейнічаць укараненню ў свядомасць самага шырокага кола нашых сучаснікаў уяўлення аб ёй як аб надзвычай важнай частцы культурнай спадчыны чалавецтва, якая мае вялікае значэнне і ў яго гісторыі, і ў сучасным жыцці.

Вызначаючыся ўнутранай цэласнасцю, традыцыйная культура беларусаў разам з тым характарызуецца багаццем лакальных праяў, што робіць культурны ландшафт на тэрыторыі Беларусі неаднародным. Як вядома, тут вылучаюцца шэсць гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў: паўночны (Падзвінне), паўднёвы (Усходняе і Заходняе Палессе), заходні (Панямонне), усходні (Падняпроўе), Цэнтральная Беларусь – і складаная сістэма традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў, такім чынам, глыбока, аб'ёмна, прадметна і пераканаўча можа быць раскрыта менавіта праз серыю рэгіянальных выданняў.

Задача серыі – даць комплексны паказ лакальнага багацця і разнастайнасці асноўных відаў традыцыйнай мастацкай культуры ў яе аўтэнтычных формах на рубяжы другога і трэцяга тысячагоддзяў. Кожны том грунтуецца на арыгінальных матэрыялах шматлікіх фальклорна-этнаграфічных экспедыцый, праведзеных з 1993 па 2010 гады ва ўсе раёны Беларусі.

Абапіраючыся на ідэю высокага статусу традыцыйнай культуры, яе вечнае, узыходзячае да асноў быцця значэнне. Што мае высокі сэнс для нацыянальнай беларускай культуры ў цэлым, аўтарскі калектыў ужо ў працэсе палявых даследаванняў кіраваўся пэўнымі прынцыпамі збору матэрыялаў, сярод якіх асноўнымі былі: аб'ектыўнасць, навуковасць, сістэмнасць, комплекснасць, верыфікаванасць, этычнасць[1]. Коратка названыя прынцыпы можна патлумачыць наступным чынам:

***аб'ектыўнасць*** азначае, што прадмет даследавання трэба разглядаць незалежна ад поглядаў, жаданняў і меркаванняў даследчыка, што, у прыватнасці, важна пры звароце да народнай рэлігійнасці;

***навуковасць*** прадугледжвае адмысловую падрыхтоўку да даследавання: вызначэнне яго мэты і праблематыкі, распрацоўку обо вызначэнне методык даследчай працы (выбар, састаўленне, адаптацыя апытальнікаў), гістарыяграфічнае вывучэнне тэрыторыі (апрацоўку публікацый па традыцыйнай культуры рэгіёна, які даследуецца, вылучэнне яго асаблівасцей, што тычацца розных відаў і жанраў традыцыйнай культуры);

[1] Дадзеныя прынцыпы вылучаны А.М. Боганевай ў ходзе выканання першага этапа («Распрацаваць прынцыпы і крытэрыі выяўлення феноменаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны») задання № 2 («Распрацаваць метадалогіі фіксацыі і рэпрэзентацыі з'яў нематэрыяльнай культурнай спадчыны (на матэрыяле асноўных відаў і жанраў традыцыйнай культуры). Стварыць інфармацыйны рэсурс «Традыцыйная культурная спадчына Беларусі» для ўстаноў культуры і адукацыі, карыстальнікаў у краінах СНД, блізкага і далёкага замежжа») Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***сістэмнасць*** патрабуе асэнсавання фальклорнай спадчыны як сукупнасці узаемазвязаных разнародных элементаў, якія ўтвараюць цэласнасць і адзінства, як у мастацкім, так і ў светапоглядным планах;

неабходнасць ***комплекснага*** падыходу выцякае найперш з комплекснага характару самога аб'екта і асаблівасцяў яго функцыянавання. Якім бы ні быў фальклорны матэрыял, сродкі і прыёмы яго выяўлення, яны ва ўсіх выпадках праецыруюцца ў галіну народных уяўленняў, вераванняў, светаразумення, народнай карціны свету. Менавіта гэтае змястоўнае адзінства дыктуе неабходнасць інтэрпрэтацыі кожнага яе звяна ў кантэксце цэлага і ва ўзаемасувязі з іншымі звёнамі [1].

Усе палявыя запісы павінны пацвярджацца аўдыя- фота-, відэафіксацыямі і навуковай аналітыкай. У гэтым сэнс прынцыпу ***верыфікаванасці***, які дазваляе пазбегнуць фальсіфікацый і непрафесіяналізму ў вучэбнай, навуковай і даведачнай літаратуры па фалькларыстыцы. Напрыклад, у фалькларыстычнай літаратуры існуе шэраг міфалагічных персанажаў (сярод іх *Кумельган*, *Дзявоя*, *Бордзя* і да т. п.), якія ў гісторыі фалькларыстыкі вядомыя толькі па адзінкавых фіксацыях, але тым не менш пераходзяць з падручніка ў падручнік, з энцыклапедыі ў энцыклапедыю, не маючы пры гэтым ніякіх адпаведнікаў ні ў мове, ні ў жывой традыцыі, ні ў іншых публікацыях фальклорных матэрыялаў. Гэтыя так званыя «міфалагічныя фантомы» [2] маюць неспалучальны і адвольны для традыцыйнай культуры набор функцый і немагчымыя сюжэтныя камбінацыі ў рамках традыцыйнага міфалагічнага вобразу, які прадстаўляе сабой, перш за ўсё, ўстойлівы набор міфалагічных функцый і характарыстык, што замацаваны імем і ўвайшлі ў традыцыю.

Прынцып ***этычнасці*** можа быть накіраваны як на прадмет даследавання, так і на суб’ект інфармацыі — носьбіта традыцыі. Даследчая праца павінна будавацца на этычных прынцыпах калектывізму (вынікі даследавання павінны быць адкрытымі для навуковай грамадскасці), універсалізму (адзнака любой навуковай ідэі павінна залежыць толькі ад яе зместу, а не ад сацыяльных і статусных характарыстык яе аўтара), арганізаваным скептыцызме (даследчыкі павінны крытычна ставіцца як да ўласных ідэй, так да ідэй, якія высоўваюцца іх калегамі). У адносінах да інфармантаў этычнасць заключаецца ва ўліку іх жаданняў (нежаданняў) дзяліцца пэўнай інфармацыяй, фігураваць у якасці інфармантаў у публікацыях.

Адметнасцю серыі з’яўляецца уніфікаваная структура ўсіх тамоў, якія складаюцца з наступных раздзелаў: «Прадмова», нарыс, які змяшчае асноўныя гісторыка-этнаграфічныя звесткі па рэгіёне, «Каляндарныя святы, звычаі і абрады», «Сямейныя звычаі і абрады», «Пазаабрадавыя песні», «Інструментальная музыка», «Танцавальны фальклор», «Народныя гульні», «Народная проза», «Малыя жанры фальклору», «Замовы», «Традыцыйнае адзенне», «Традыцыйны народны тэкстыль». Такім чынам, у распараджэнні даследчыкаў зараз знаходзіцца выданне, якое з’яўляецца ўнікальнам зводам дадзеных па традыцыйнай культуры Беларусі, змяшчае матэрыял, які ўпершыню ўводзіцца ў навуковы ўжытак і дае багатую базу для параўнання з дадзенымі, зафіксаванымі ў класічных зводах М. Нікіфароўскага, А. Сержпутоўскага, Ч. Пяткевіча, М. Федароўскага, П. Шэйна, О. Кольберга.

Усе тамы серыі маюць агульную структуру і выкананы па адзінай методыцы, што дае магчымасць выяўлення спецыфічных рыс кожнага рэгіёна на аснове параўнання такіх параметраў, як суадносіны ў кожнай з галін аўтэнтычнай культуры ранняга і позняга гісторыка-стылявых пластоў; асаблівасці сістэмы традыцыйных абрадаў на дадзенай тэрыторыі і структура гэтых абрадаў; перавага пэўных форм і жанраў у розных відах народнай творчасці і мясцовае асэнсаванне форм і жанраў, якія маюць агульнабеларускае пашырэнне; характар іх распаўсюджання (арэальны аспект); стылістыка і паэтыка вусна-праэтычных жанраў; ва ўласна мастацкіх відах творчасці – стылявыя асаблівасці і асаблівасці выканальніцтва (вытворчасці); народныя тэрміналагічныя вызначэнні тых ці іншых з’яў мясцовай народнай культуры[2].

Гэтая сукупнасць па-рознаму праяўляецца ў розных рэгіёнах, што ў многім вызначае рэгіянальную спецыфіку традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў. І яшчэ два фактары, якая таксама знайшлі адлюстраванне на старонках кніг серыі, яскрава ўплываюць на характар народнай аўтэнтычнай культуры кожнага рэгіёна. Адзін з іх – узаемадзеянне культурных плыняў з тэрыторый, якія акружаюць той ці іншы рэгіён: так традыцыі Гродзенскага Панямоння зазналі ўплывы культурных токаў Паазер’я, Брэсцкага Палесся, Польшчы, Прыбалтыйскіх краін; культура Магілёўшчыны – уплывы рускіх традыцый; Брэстчыны – традыцый польскай і ўкраінскай народных культур; Гомельшчыны – пераважна рускай; этнакультурны комплекс Цэнтральнай Беларусі «сканцэнтраваў у сабе, нібы ў фокусе, шматлікія рысы і элементы, характэрныя амаль для ўсіх рэгіёнаў» [4, с. 89].

Важны фактар, які вызначае характэрныя рэгіянальныя і лакальныя рысы сучаснай беларускай традыцыйнай культуры – спалучэнне архаічных светапоглядных уяўленняў, вераванняў, магічных практык, абрадаў і звычаяў (напрыклад, выкліканне дажджу, ваджэнне русалкі і інш.) з хрысціянскім веравучэннем, якое праяўляецца пераважна на ўзроўні маралі, прынцыпаў стварэння сям’і, выхавання дзяцей, стаўлення дзяцей да бацькоў, ўзаемастасункаў і ўзаемаадносін паміж людзьмі. У гэтым плане выразна адрозніваюцца заходні і ўсходні рэгіёны Беларусі: калі на захадзе ступень рэлігійнасці і вацаркоўленасці насельніцтва з’яўляецца высокай, то на ўсходзе яны значна меншыя і ў асобных выпадках даходзяць да атэізму.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў прадстаўлена ў серыі ў сінхронным зрэзе. Сінхронны метад даследавання, які прадугледжвае вывучэнне соцыума (у нашым выпадку вясковых знаўцаў мясцовай аўтэнтычнай культуры) як структурнага адзінства, дазволіў, з аднаго боку, вызначыць асаблівасці сучаснага

[2] Для рэгіянальных песенных сістэм такія параметры распрацаваны З.Я. Мажэйкай [3, с. 140].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стану традыцыйнай культуры рэгіёна, з другога – дыяхронную разнастайнасць праяў гэтай культуры, якая стагоддзямі фарміравалася ў кожным з гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, склаўшы ў выніку сучасны культурны ландшафт з усёй яго непаўторнасцю і непадобнасцю на адпаведныя культурныя ўтварэнні іншых краін свету.

Сучасны стан беларускай традыцыйнай мастацкай культуры характарызуецца суіснаваннем дзвюх яе формаў – актыўнай і пасіўнай. Згодна з першай формай – традыцыі ў натуральным выглядзе працягваюць жывое існаванне ў сучасным побыце вяскоўцаў і вылучаюцца значнай ступенню самаарганізаванасці; згодна з другой – жыццё традыцыі працягваецца толькі ў памяці старэйшага пакалення сельскіх жыхароў, памяці, якая ўчэпіста ўтрымлівае падрабязныя звесткі аб самых розных праявах традыцыйнай культуры, што яшчэ зусім нядаўна былі для гэтых людзей натуральным жывым асяроддзем.

Адна з галоўных задач серыі – раскрыць традыцыйную культуру, гледзячы на яе не толькі вачыма прафесійных даследчыкаў, а ў першую чаргу саміх яе носьбітаў. Таму такое важкае месца ў публікацыі займае простая дыялектная мова жыхароў шматлікіх вёсак, сёл, мястэчак, раённых цэнтраў Беларусі, ад якіх аўтары атрымалі тыя звесткі, што леглі ў аснову адпаведных раздзелаў кніг серыі. Можна сказаць, што «голас» традыцыйнай культуры літаральна пранізвае ўсё выданне: напрыклад, матэрыялы раздзелаў, прысвечаных каляндарным традыцыям, прадстаўлены пераважна ў форме мемаратаў; раздзелы народнай прозы цалкам складаюцца з твораў розных жанраў, пададзеных у неадаптаваным выглядзе (з нязначнай доляй аўтарскай праўкі); у раздзеле, які разгортвае панараму абрадаў жыццёвага цыкла, простая мова носьбітаў арганічна спалучаецца з аўтарскім тэкстам, гэтыя ж прыёмы вытрымліваюцца ў раздзелах «Традыцыйнае адзенне» і «Традыцыйны народны тэкстыль»; нават у тых раздзелах, дзе спецыфіка матэрыялу вымагае спецыфічнага графічна-вербальнага апісання («Танцавальны фальклор»), або прадстаўляецца ў выглядзе нотных расшыфровак («Пазаабрадавыя песні», «Інструментальная музыка») іх аўтары імкнуцца падаць народную тэрміналогію, выразныя характарыстыкі, якія самі выканаўцы, іх слухачы ці гледачы даюць мастацтву аднавяскоўцаў, трапныя выслоўі, прыказкі, прымаўкі, што напаўняе аўтарскія тэксты тым свежым паветрам, якім дыхае сама народная культура. У цэлым аспект псіхалогіі носьбітаў беларускай традыцыйнай культуры раскрываецца ў серыі як узаемазвязанае адзінства трох кампанентаў: кагнітыўнага (адлюстраванне ўяўленняў чалавека «аб свеце і аб сабе»), эмацыянальна-аксіялагічнага (адносіны да сябе, да іншых людзей, ацэнка з'яў і падзей аўтэнтычнай мясцовай культуры) і паводзіннага (стаўленне да агульнапрынятых нормаў і стандартаў паводзін, асабліва ў абрадавай культуры).

У цэлым, амаль дваццацігадовае вывучэнне сучаснага стану беларускай традыцыйнай культуры паказала, з аднаго боку, невычарпанасць энергіі культурных традыцый народа і прыхільнасць карэннага вясковага беларуса да сваёй культуры, з другога – існаванне моцнага ментальнага падмурка для працягу жыцця традыцыі ў новых жыццёвых умовах і новых пакаленнях беларусаў. Ва ўмовах глабалізацыі і інфарматызацыі традыцыя становіцца сувязным звяном з гістарычнай памяццю і дапамагае захаваць нацыянальна-культурную ідэнтычнасць. Не дзіўна таму, што выданне «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» ужо стала крыніцай новых ведаў і матэрыялаў, як для шырокага кола спецыялістаў – фалькларыстаў, этнолагаў, этнамузыколагаў, этналінгвістаў, так і для сферы культуры і адукацыі.

Апошняе ўяўляецца сёння асабліва актуальным, паколькі менавіта ў гэтых сферах на Беларусі зараз пашырыўся рух рэвіталізацыі традыцыйнай культуры, што важна і для вёскі, і для горада. У першым выпадку працэсы рэвіталізацыі садзейнічаюць ажыўленню і ўзнаўленню аўтэнтычных форм традыцыйнай культуры на месцах натуральнага іх бытавання; у другім – ствараюць умовы для авалодання каштоўнасцямі народнай культуры шырокім колам гарадскіх дзяцей і моладзі, якія далучаюцца да яе вусным шляхам, г. зн. так, як гэта заўсёды адбывалася ў культуры вуснай традыцыі.

У Беларусі ў сферы вышэйшай школы на чале працэсаў рэвіталізацыі традыцыйнай культуры зараз стаіць УА БДУКМ, дакладней, кафедра этналогіі і фальклору ўніверсітэта (загадчык – Вячаслаў Калацэй), сутнасць дзейнасці якой – у падрыхтоўцы спецыялістаў, арыентаваных у творчых праявах на першакрыніцы мастацтва вуснай традыцыі, а не на іх сурагатны, апрацаваны варыянт. Пры падрыхтоўцы па напрамку «Фальклор» спецыяльнасці «Народная творчасць» выкарыстоўваецца т.зв. метад дэманстратыўнай антрапатэхнікі, калі студэнт (асоба, якая пераймае) развучвае тое, што транслiруе носьбіт лакальнай традыцыі (асоба, якае дае ўзор для пераймання), а не тое, што прапануе аранжыроўшчык, рэдактар нотнага ці харэаграфічнага тэксту. Фальклорныя адзінкі ў гэтым выпадку (з дапамогай аўдыя- ці відэазапісаў, калі асабісты кантакт з носьбітамі немагчымы) аднаўляюцца студэнтам максімальна блізка да арыгіналу, з тлумачэннем рэгіянальнай і асобаснай прыналежнасці мастацкага твору. Асобныя адзінкі «складваюцца» ў структуру лакальнага абраду ці фальклорнай дзеі, аднаўленне якой выпускнікі прэзентуюць у якасці дыпломнага праекта. Паводле дыпломнага праекта пішацца дыпломная работа аналітычна-прагнастычнага (што варта рабіць для захавання і пераемнасці мясцовай традыцыі) напрамку.

З першых год існавання кірунак рэвіталізацыі стаў асновай навучальнага працэсу кафедры: рэгулярна ладзіліся фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі на 1 курсе, шырока практыкаваліся творчыя зносіны з майстрамі аўтэнтычных спеваў краіны, навучанне зафіксаваным у экспедыцыях спевам вялося «з голасу» народных выканаўцаў (у асабістых стасунках і праз аўдыязапісы) або з дапамогай адпаведным чынам падрыхтаваных выкладчыкаў. Абавязковым «творчым экзаменам» кожныя два гады для студэнтаў-фалькларыстаў стаў удзел у фестывалі дзіцячага і юнацкага фальклорнага мастацтва «Берагіня», канцэптуальна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спланаваным аўтарамі серыі як паводзінная ілюстрацыя рэгіянальнай пераемнасці яе зместу. З першых жа крокаў разгортвання новага кірунку ў дзейнасці ўніверсітэта паўсталі і пытанні яго забеспячэння вучэбнай і метадычнай літаратурай. І хаця зараз многія з іх вырашаны, на змену ім прыйшлі іншыя. Таму на фоне пастаяннага недахопу неабходнай літаратуры серыя «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» стала ў наш час тым фальклорным зводам, які арыентаваны ў тым ліку і на рэвіталізацыю лакальных сістэм мастацтва вуснай традыцыі, своеасаблівым «арыенцірам», «компасам» і «даведнікам» па этнафанічнай, этнахарэагрэаграфічнай, абрадавай мапе жывых праяў фальклорнай спадчыны Беларусі.

Таму зараз кнігі збору сталі на кафедры, можна сказаць, настольнымі: іх матэрыялы выкарыстоўваюцца ў шэрагу лецкыйных курсаў («Вусная народная творчасць», «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці», «Фальклорны практыкум», «Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства» ды інш.); яны з’яўляюцца своеасаблівым вучэбна-метадычным дапаможнікам пры рэканструкцыі абрадаў і святаў, а таксама пазаабрадавых рэкрэацыйных практык; гэта таксама крыніца рэпертуару для аматарскіх фальклорных калектываў, стыль выканання якіх максімальна набліжаны да аўтэнтычнага (4, 5 і 6 тамы маюць электронныя дадаткі ў выглядзе кампакт-дыскаў, дзе пададзены ўзоры песень, інструментальнай музыкі і народнай прозы ў выкананні вясковых спевакоў, музыкаў, апавядальнікаў); гэта крыніца матэрыялаў для напісання курсавых і дыпломных работ, асноўная мэта якіх – рэвіталізацыя на навуковай аснове канкрэтных культурных традыцый розных мясцін Беларусі. У 2014 г., напрыклад, такім абрадам былі «Зялёныя сяткі», якія сіламі выкладчыкаў і студэнтаў былі прадстаўлены ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту ў вёсцы Строчыца; у рамках мінулагодняй канферэнцыі БДУКМ «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання» там жа адбыўся паказ веснавога абраду «Юр’я»; удзельнікі гэтай канферэнцыі 1 мая таксама ў Строчыцы ўбачаць валачобны абрад. У 2007–2013 гадах быў рэалізаваны праект Аляксея Галіча і Таццяны Пладуновай «Гуканне вясны», якое адбывалася ў Мінскім парку імя М. Горкага. І гэта толькі частка работы кафедры ў гэтым кірунку.

Пад «аднаўленчы механізм» дыпломнага праектавання выпускнікоў кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ ужо трапілі веткаўская Страла, бешанковіцкі Вялікдзень, хойніцкая Русалка, лунінецкі Куст, полацкая Жаніцьба Цярэшкі і іншыя фрагменты жывой «мазаікі» мастацтва вуснай традыцыі беларусаў мяжы XX–XXI стагоддзяў. Узаемадзеянне «носьбіт – пераемнік» у працэсе падрыхтоўцы і рэалізацыі дыпломнага праектавання робіць непазбежны ўплыў на абодвы бакі. Магчыма, пры спрыяльных абставінах, звышзадача аўтараў збора («пераканаць носьбітаў традыцыі ў неперажожнай жыццяздольнай сіле іх мастацтва + сістэмна падключыць маладое пакаленне да інфармацыйных і эстэтычных крыніц каранёвай культуры беларусаў») будзе спакваля, але сістэмна «крок за крокам» вырашацца. І сацыяльнакультурная сфера краіны атрымае асоб, якія будуць здольныя не толькі трызніць па зыходзячым высокім мастацтве, але і свабодна існаваць у сістэме яго эстэтыкі, этычна-светапоглядных асноў, лексікі і выразных сродкаў.

**Спіс літаратуры:**


1. Толстая, С. М. К проблеме комплексного изучения фольклора / С. М. Толстая // Фольклор. Песенное наследие. — М. : Наука, 1991. – 320 с.
2. Левкиевская, Е. Е. Механизмы создания мифологических фантомов в «Белорусских народных преданиях» П. Древлянского / Е. Е. Левкиевская // Рукописи, которых не было. Подделки в области славянского фольклора. – М. : Ладомир, 2002. – С. 311 – 351.
3. Можейко, З. Я. Календарно-песенная культура Белоруссии : опыт системно-типологического исследования / З. Я. Можейко. – Минск. : Навука і тэхніка, 1985. – 245 с.
4. Цітоў, В. С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі / В. С. Цітоў. – Мінск. : Беларусь, 1996. – 208 с.



***Bogdan Matławski***


**LUDOWE ZESPOŁY ŚPIEWACZE I KAPELE W KULTURZE POMORZA ZACHODNIEGO W LATACH 1945 -1990**


*Artykuł zawiera analizę zespołów folklorystycznych w Pomorzu Zachodnim - region w południowej części Morza Bałtyckiego, która od 1945 roku zadomowiła się w tej części Polski, a dziś jest zamieszkany głównie przez Polaków.*



***Bogdan Matlavsky***


**FOLK-SONGS GROUPS AND CHAPELS IN WESTERN POMERANIA CULTURE IN YEARS 1945 -1990**


*The article provides the analysis of folk groups in Western Pomerania – the region in the south of the Baltic Sea, which became firmly established in the part of Poland since 1945 and today inhabited mainly by Poles.*


***Zarys kształtowania się muzycznej kultury ludowej w regionie.*** Do 1948 roku działania władz szczególnie silnie koncentrowały się na zaszczepieniu na terenie Pomorza Zachodniego (il. 1) kultury polskiej, co było akceptowane przez osadników, bowiem różne formy ludowego śpiewania i grania oraz wspólne uczestnictwo we wszelkich imprezach były, tuż po osiedleniu jedną z pierwszych i ważniejszych potrzeb ówczesnego społeczeństwa. Dominowało



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ